Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 14 Вільня, Пятніца 11 Красавіка 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл. на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў аднэй шпальце

500-лецьце сьмерці Вітаўта.

(1430-1930)

Хто ўважна чытаў краёвыя газэты: беларускія, літоўскія і польскія, той лёгка спасьцярог, што ўсе яны з нязначнымі вынияткамі дяволі многа пішуць аб Вітаўце.

Хто-ж гэта такі і чаму аб ім так загаварылі? Гэта Вялікі Князь Літвы, сын Кейстута і Біруты, стрыечны брат Ягайлы, жыў ён у другой палове 14-га і ў пачатку 15-га сталецьця. Памёр 27 кастрычніка 1430-га году. Сёлета мінае такім чынам 500 гадоў ад яго сьмерці.

Час Вітаўта — гэта пачатак, ці лепш сказаць — першая палова так званага літоўскага пэрыоду нашай гісторыі. У гэтым часе беларускія землі ўжо бадай цалком увахОдзілі ў склад Вялікага Князьства Літоўскага, становячага адну супольную дзяржаву Літоўцаў, Беларусаў і Украінцаў, а мова наша ўжо выразна пакідала перажыткі старадаўнай агульна-славянскай, так званай царкоўна-славянскай мовы і пераходзіла ў сучасную нашу мову народную, якая станавілася мовай ураду, суду, грамадзкага жыцьця і культуры гэтай дзяржавы.

Праўда, пасьля першай уніі Літвы з Польшчай у Крэве 1386-га году, а так-жа пасьля Гарадзельскага сойму 1413-га году Літва, а ў тым ліку і нашыя землі, фармальна былі злучаны з Польшчай у вадно цэлае пад уладай аднаго польскага караля, але сапраўды ўлада гэтага караля была толькі на славах і Літва з нашымі землямі пад назовам Вялікага Князьтва Літоўскага была фактычна самастойнай дзяржавай.

Самастойнасьць Вялікага Князьтва Літоўскага адваяваў ад Ягайлы і ад Польшчы, развіў яе, расшырыў і ўмацаваў Вялікі Князь Вітаўт, які для гэтай ідэі, як захадамі дыплёматычнымі, так і сілай аружнай працаваў на працягу 38-х гадоў. Сваю геніяльную працу для самастоўнасьці нашых зямель слаўны Вітаўт жадаў закончыць поўнай незалежнасьцяй ад Польшчы, ня толькі фактычнай — але і праўна, фармальнай, карануючы сябе на караля ўсіх зямель Вялікага Князьтва Літоўскага. Плянам гэтым перашкодзілі Палякі, не дапусьціўшы пасланцоў нямецкага цара Сігізмунта вёзшых для Вітаўта царскую карону. Далей працаваць дзеля завяршэньня сваіх патрыотычна-геніяльных плянаў Вітаўт ня мог, бо маючы 80 гадоў жыцьця, надарванага бязупыннай працай для дабра свайго краю, перажыўшы ўрэшце няўдачу з каронай, гэты магутны асілак, як мы ўжо ўспомнілі, 1430-га году расстаўся з гэтым сьветам.

Сяньня, у 500-ыя ўгодкі, памяць аб Вітаўце ажыла, уваскрэсла. Першыя, рэч зразумелая, прыпомнілі аб ім Літоўцы: сьпарша ў Літве незалежнай, а за ёй і ў Літве пад Польшчай. Там і тут паўсталі адпаведныя літоўскія камітэты дзеля сьвяткаваньня гэтых вялікіх угодкаў. Камітэты гэтыя вядуць натужную працу, каб належна ўшанаваць Вітаўта, вялікага генія літоўскага народу.

Паўстаў так-жа ў Вільні і камітэт польскі дзеля сьвяткаваньня Вітаўтаўскага юбілею. Але паўстаў ён, як можна бачыць з польскіх газэт, а так-жа з некаторых польскіх працаў гістарычных, дзеля таго, каб даказаць, што Вітаўт менш рупіўся аб незалежнасьць свайго краю, а больш служыў ідэі Ягеллавай, так карыснай для Польшчы, ідзі адданьня Літвы і нашых зямель Польшчы на ўласнасьць. Словам, намер польскага вітаўтаўскага камітэту ў Вільні прадусім палітычны і яўна разыходзіцца з праўдай гістарычнай.

Урэшце, пры Беларускім Нацыянальным Камітэце у тэй-жа Вільні паўстала адумысловая камісія так жа дзеля сьвяткаваньня 500 угодкаў сьмерці Вялікага Вітаўта.

Што нас змушае рабіць гэта? Той факт, што Вітаўт у вялікай меры змагаўся і за нашу самастойнасьць, за долю і нашага народу і тымі хадзіў дарогамі, якія сяньня вядуць і да нашай самастойнасьці.

З боку Тэўтонскіх Рыцараў грозіла вялікая небясьпека, як для Літвы, так і для Славян, а ў іх ліку і для нас. Вялікі Вітаўт, на чале польскіх і беларускіх палкоў даў рашучы адпор грознай тэўтонскай навале 1410 г. у слаўнай бітве пад Грунвальдам.

Польшча ад вякоў імкнулася на ўсход, пасягаючы на наш народ, на нашу самастойнасьць. Вялікі Вітаўт усе сілы свае пасьвяціў на змаганьня з Польшчай за незалежнасьць краю.

З паўдня часта на нашыя землі ішлі дзікія татарскія орды, а з усходу, прабуючы сіл сваіх на грудзях нашага краю, паўставала ўжо Масква, так-жа пасягаючы на наш народ, на яго самастойнасьць палітычную і культурную. І гэтыя ўсе грозныя сілы адхлынулі назад з нашых зямель, пабітыя мячом Вялікага Вітаўта.

Граніцамі Вялікага Князьтва Літоўскага за часаў слаўнага Вітаўта было Чорнае і Балтыцкае мора, а ў гэтых граніцах жылі вольныя народы: Літоўцы, Беларусы, Украінцы. Гэта цяпер нанова ўскрашае. Вольныя, незалежныя, шчасьлівыя, культурныя народы на сваіх уласных землях — гэта наш ідэал.

Абразок жыцьця ў Саветах.

(*Гутарка з уцёкшымі з С.С.Р.Р. „Новий Час„ № 39*).

— Што будзе вясной? — Прыходам вясны людзі ня цікавяцца. Скаціны няма, насеньня так-жа, зямлі свaeй нікто ўжо цяпер ня знае. Усе цяпер думаюць толькі, як бы сяньня пад'есьці. Аб заўтрашнім дні нікто ня думае. Бяднейшыя гаспадары ўжо цяпер галадуюць. Багацейшыя, каторым удалося што-колечы схаваць-закапаць у зямлю—даядаюць апошнія свае запасы. За месяц будзе там голад. Аб гэтым кажуць і самы камуністы. Простыя камуністы, каторыя ня ёсьць ані камісарамі, ані якімі ўрадоўцамі, праклінаюць таксама бальшавіцкія парадкі. Найадважней процiў камуністычных уладаў выступаюць жанчыны. Мужчын у вёсках ужо ня шмат ёсьць. Некаторых кудысьці павывозілі, некаторых пазабівалі, а некаторыя хаваюцца па лясох. У некаторых сёлах жанчыны змагаюцца з камуністамі на жыцьцё на сьмерць і незважаючы, што іх шмат пабілі, аднак яны не далі камуністым адабраць царкву ні царкоўнага звану. У многіх сёлах сяляне перахоўваюць сьвяшчэньнікаў, хаваючы іх ад камуністаў. Сьвяшчэньнікаў вельмі мала асталося. Вялікае шчасьце, калі на 10 прыходаў ёсьць адзін сьвяшчэньнік. Сяляне змучаныя бядой не баяцца ўжо і колектываў — камуны. Кожны згадзіўся-б працаваць хоць у чарта, каб толькі мець хоць крыху запэўненае жыцьцё. Але бяда, што ў камунах нічога так-жа няма. Ня ведама, ці камісары крадуць ці можа такія вялікія падаткі. Тыя сяляне, якія працуюць 3—4 гады ў камуне — ўсе голыя і галодныя. Пратэставаць ня можна. Забастоўка, або хоць гутарка аб забастоўцы, караюцца сьмерцяй. Работнікі ў камуне ня маюць ніякай кантролі над камунай. Усей гаспадаркай кіруюць партыйныя камуністы. У камунах працуюць пад прымусам. Хто ў які дзень не працуе, таму і есьці не даецца. Ядуць у супольнай кухні. Хто некалькі разоў не зьявіўся да работы, дык яго „зьнікаюць" г. зн. прыяжджаюць агенты Г. П. У. і ён з імі недзе „зьнікае" — як контррэвалюцыянер. Кіраўнікі камунаў такія няміласэрныя, што нават бярэмянныя жанчыны мусяць працаваць да апошніх дзён. Бываюць выпадкі, што жанчыны трыманыя пры працы да апошніх дзён бярэмянаясьці, адбываюць пароды на полі ў часе працы. Камуны ўсе банкрутуюць. Банкрутуюць нават і тыя камуны, якія маюць адпаведныя прылады. З збанкрутаваўшых камунаў людзі ідуць у сьвет самі нявелаючы кулы. Некаторым удаецца ўцячы заграніцу, некаторых камуністы забіваюць або кудысьці вывозяць як контррэвалюцыянераў.

—о—

Аб гэтым расказвалі ўцякачы з С.С.Р.Р. карэспандэнту украінскай газэты „Новий Час", якія праяжджалі ў Чэхаславаччыну.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Прысылайце падпіску на «Беларускую Крыніцу».

З Беларускага жыцьця.

З БЕЛАРУСІ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Юбілей Вітаўта. Прэзыдыум Бел. Нац. К—ту на сваім паседжаньні 2 г. м., выконываючы пастанову агульнага сходу К-ту, выбраў камісію дзеля ўтварэньня Камітэту для сьвяткаваньня 500-лецьця сьмерці Вял. Кн. Вітаўта. Камісія выбрана з 3-х асоб: кс. Адам Станкевіч, сэн. В. Багдановіч і пас. Ф. Ярэміч. Камісіі даручана весьці перагаворы з Літоўскім Тымч. Камітэтам у справе ўтварэньня супольнага Камітэту для абходу Вітаўтаўскага юбілею.

Гадавы сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Дня 6 красавіка с. г. адбыўся гадавы сход Рады Бел. Інст. Гаспад. і Культуры з наступным парадкам дня: 1, Справаздачы Цэнтральнага Ураду з дзейнасьці за мінулы год і Рэвізыйнай Камісіі. 2, Перавыбары Цэнтральнага Ураду і Рэвізыйнай Камісіі. 3, План далейшай працы.

На старшыню сходу паклікaны сэн. Багдановіч, на заседацеляў: кс. В. Гадлеўскі і пас. Стэповіч, на сакратара С. Сьвістун.

1. З справаздачы Старшыні Цэнтр. Ураду кс. В. Гадлеўскага вілаць, што Бел. Інст. Гасп. і Культуры мае ў Зах. Беларусі 69 гурткоў. Гурткі Бел. Інст. Гасп. і Культ. у мінулым годзе зладзілі на тэрыторыі Зах. Беларусі 40 беларускіх спэктакляў-прадстаўленьняў з канцэртнымі выступленьнямі беларускіх хораў. Сябры Цэнтр.Ураду прачыталі на вёсцы 8 навукова-папулярных лекцыяў. Адкрыты ў працягу мінулага году пры гуртках Інстытуту 3 бібліятэкі-чытальні і 3 бібліятэкі-чытальні папоўнены. Агулам бібліятэк чытальняў на вёсцы Бел. Інст. Гасп. і Культ. налічвае 36. Апрача бібл.-чыт. на вёсцы, Б. І. Г. і К. мае цэнтральную бібліятэку ў Вільні, якая ў мінулым годзе папоўнена і налічвае 427 экз. кніжак. Пры цэнтр. бібл. у Вільні у мінулым годзе адкрыта публічная чытальня. Бел. Інст Гасп. і Культ. утрымлівае 2 прыватныя пачатковыя беларускія школы; у Шаўлянах і Рудаўцы. Цэнтр. Урад Інстытуту адбыў у працягу мінулага году 24 паседжаньні. Наладзіў сьвяткаваньні: 3-х угодкаў сьмерці К. Сваяка і 400-лецьце выданьня Літоўскага Статуту. Праведзены пратэст супроць неадпаведнага і шкоднага для беларусаў „Лемантара“ Л-Маеўскага, выданага польскім дзяржаўным выдавецтвам.

З справаздачы Рэвізыйнай Камісіі выявілася, што сябры Цэнтр. Ураду Бел. Інст. Гасп. і Культ. і агулам Цэнтр. Урад выконываў свае абавязкі сумленна і споўніў сваё заданьне паводле магчымасьці здавальняюча.

Рада Бел. Інст. Гасп. і Культ. справаздачу стар. Цэнтр. Ураду і Рэвізыйнай Камісіі прыняла да ведама.

2. Пасьля прыняцьця справаздачаў: старшыні Цэнтр. Ураду і Рэвізыйнай Камісіі, Рада Бел. Інст. Гасп. і Культ. прыступіла да перавыбараў Цэнтр. Ураду.

На старшыню выбраны кс. В. Гадлеўскі, у склад Цэнтр. Ураду: кс. А. Станкевіч, сэн. В. Багдановіч, пас. Ф. Ярэміч, А. Стэповіч, студ. М. Пецюкевіч і рэд. С. Сьвістун. У Рэвізыйную Камісію: сэн. В. Рагуля, студ. Т. Куніцкі, рэд. Я. Пазьняк і коопэр. Э. Будзька.

3. Па закончэньні выбараў Цэнтр. Ураду і Рэвізыйнай Камісіі, Рада І стытуту, намячаючы плян далейшай працы Бел. Інст. Г.. і Культ. выразіла пажаданьне імкнуцца да пашырэньня кооперацыі; паводле магчымасьці прыступіць да выдаваньня гаспадарча-навуковай часопісі і дамагацца рэалізацыі асыгнаваных крэдытаў у польскім дзяржаўным буджэце на беларускія вуч. курсы, вуч. сэмінарыю і выдавецтва.

Паседжаньне абноўленага Цэнтр. Ураду Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Дня 7 г. м. адбылося паседжаньне абноўленага Цэнтр. Ураду Бел. Інст. Гасп. і Культ. На паседжаньні гэтым абноўлены ўрад утварыўся ў наступным складзе: Старшыня кс. В. Гадлеўскі (выбраны на гэнае становішча Радай) віцэстаршыні: сэн. В. Багдановіч і пас. А. Стэповіч, скарбнік кс. А. Станкевіч, сэкэтар рэд. С. Сьвістун, сябры ўраду: пас. Ф. Ярэміч і студ. М. Пецюкевіч.

У 30-я ўгодкі сьмерці Фр. Багушэвіча, якія прыпадаюць сёлета, Урад Бел. Інст. Гасп. і Культ. пастанавіў наладзіць набажэнства па сьв. памяці Фр. Багушэвічу і ўрачыстую акадэмію. Набажэнства мае адбыцца летам у Жупранах, дзе магіла песьняра. Акадэмія мае быць наладжана ў восень. Пастаноўлена так-жа ў гэтым годзе выдаць нанова ўсе творы Фр. Багушэвіча.

Панаўленьне дамаганьня канцэсіі на бел. вуч. сэмінарыю. Дзеля таго, што распачатыя ў 1927 г. дамаганьні праз Бел. Інстытут. Гасп. і Культ. канцэсіі на беларускую вучы ельскую сэмінарыю да гэтай пары ня зьдзейсьнены, Цэнтр. Урад на сваім паседжаньні пастанавіў гэтыя дамаганьні ўзнавіць і выслаў 8 г. м. дэлегацыю да віленскага школьнага Куратара у асобах: старш. ураду кс. В. Гадлеўскага і сябры ўраду пас. Ф. Ярэміча.

Звальненьне з вастрогу б. беларускага пасла Ю. Сабалеўскага. 1 г. м. у Апэляцыйным Судзе ў Вільні разглядалася судовая справа Ю. Сабалеўскага. Апэляцыйны Суд, не знайшоўшы праступку ў абвінавачаньні, Ю. Сабалеўскага апраўдаў.

Як ведама, б. пасол Ю. Сабалеўскі віленскім Акружным Судом, пасьля чатырохдзённай расправы, быў засуджаны на 6 гадоў цяжкога вастрогу. Цяпер гэны прысуд Апэляцыйным Судом скасаваны і Ю. Сабалеўскі адседзеўшы 1 год і 10 месяцаў нявінна ў вастрозе, знаходзіцца на волі. Пракурор незадаволены прысудам Апэляцыйнага Суду, перадаў справу ў Суд Найвышэйшы.

Новыя кніжкі. У апошнія часы вышлі з друку і прадаюцца кніжкі: „Jak Hanulka zbirałasia ŭ Arhientynu“ W. A і „Daroha Kryža“ J. Byliny. Абедзьве кніжкі выдавецтва „Chryścijanskaj Dumki“. Цана гэтых кніжак па 30 гр. Галоўны склад кнігарня „Пагоня“ Вільня, Людвісарская 1.

„Школа і жыцьцё.“ Пад такім загалоўкам пачаў выходзіць у Латвіі беларускі літаратурна-грамадзкі і пэдагагічны месячнік Т-ва беларускіх вучняў у Латвіі. Часопісь гэна выходзіць у Рызе.

З Польшчы.

Прэм'ер Славэк аб новых выбарах у Сойм і Сэнат. Прэм'ер польскага ураду палкоўнік Славэк у гутарцы з прадстаўнікамі прэсы заявіў, што тэрмін развязаньня Сойму і Сэнату яшчэ не ўстаноўлены. Насамперш мусіць наступіць успакаеньне краю, а пасьля могуць адбыцца новыя выбары.

У гэтай гутарцы новы прэм'ер польскага ураду між іншым сказаў, што „сучасны Сойм ня будзе ўжо мець свайго голасу“ і што „ідзём да таго, каб грамадзянства выразіла сваю апінію ў новых выбарах“.

Словам, паводле заявы „галавы“ сучаснага польскага ураду, польская ўнутраная палітыка — разрыву Сойму з урадам — мае знайсьці разьвязку ў новых выбарах у законадаўчыя палаты.

Аб скліканьні праваслаўнага Сабору. Як ведама, распачатая ў мінулым годзе

І. Білюнас.

Брысяў канец.

Вобак варот хлява, на вялікай кучы кастры, сьпіць сабе стары Брысь... — ужо добра падсьляпаваты і значна працьверы. Бачыць ён яшчэ — бачыць, але толькі як праз дым, часта здараецца, што нават не пазнае свайго гаспадара. Цяжкая і яму старасьць прышлася: — апушчаны і усімі забыты. Разумее ён добра, што мала каму ўжо можа быць патрэбным, але усё-ж, як толькі можа, стараецца яшчэ быць для хаты карысным. Хоць троха ўжо і недачуе, а заплюшчыўшы хворыя вочы больш бываюць заплюшчаны цяжкімі векамі, сіліцца аднак Брысь праганяць ад сябе назойлівы сон і стараецца прыслухывацца, што робіцца на панадворку. Слухаў раз, слухаў, ды і заснуў, выцягнуўшы морду на доўгія лапы і скрозь сон чуе — нешта сусім блізка шамоціцца, як-бы ідзе хто чужы... Стары Брысь з свайго логава падымаецца цяжка і зрэдка брэша сваім сапліВым ахрыпшым голасам.

— А ці ты ня сьціхнеш, сьляпак. Ужо свайго чалавека ня бачыш... і ў нездаволеным крыку чуе Брысь голас знаёмы.

Саромліва косіць Брысь губы бяззубага роту, жалобна скавыча, быццам перапрашаючы за памылку і падабраўшы хвост, ізноў скручываецца ў камок на сваім логаве.

Чуцьцё ужо няраз ашуківала Брыся і нарабляла шмат яму сораму. Бывала сплючы ў хаце пад лаваю часта яму сьніліся то зладзеі, то ваўкі, ім замоладу здаралася рабіць перашкоды і яму ў васьне пачалося здавацца, што ізноў спатыкаецца ён з старымі сваімі ворагамі: падымае тагды асалавелую сваю галаву і быццам з перапуду для вока другога, сусім неспадзеўна брахне на ўсю хату: гаў! гаў!...

На вялікае зьдзіўленьне, замест зладзеяў чуе толькі з усіх старон вымоўкі:...

— А каб яго ліха, наш сівы старызна саўсім ужо здурнеў!

Ня ведаючы, гдзе ад сораму дзецца, падабраўшы хвост, вяла перабіраецца наш Брысь на новае месца пад сонца.

— Куды прэсься, вон пашоў! З усіх бакоў крычаць на яго.

І Брысь поўны сораму, нясецца за дзьверы... А цяпер ён у хату баіцца нават і на часіну ўбегчы .. Лепш яму на кастроўніку спаць: усё-ж спакайней і менш другім будзе замінаць пад нагамі.

Праўда, у хаце шмат выгадней спаць у цяпле пад сталом, але-ж цяпер усё роўна, касьцей грысьці ўжо больш ён ня можа, а ад мух і там трудна на старасьць адаганяць. Яго стары век і тут часамі спагад спатыкае: калі-нікалі прыносіць яму гаршчок крупнікy пасёрбаць, а як забудуцца, што часта бывае, есьці добра захоча, пойдзе сабе Брысь, пабродзіць па знаёмых падворках, усё-ж што-небудзь ды знойдзе, хоць даўней на гэтакую страву і глядзець не хацеў. Пад старасьць даволі часта прыходзілася і проста галадаваць нашаму Брысю.

Аднак-жа і ён быў у сваім часе маладым, сільным і ўсімі адпаведна апэнены, ня мог тады ацярабіцца ад людзкіх ласкаў. Дурэлі з ім дзеці, даваўся вазіць іх запрэжаны ў санкі, ніколі на іх не злаваў, калі часамі без усякае патрэбы які-небудзь малы і вытне яго па боку, разумеў, што дзеці яшчэ малыя сусім, слабыя на сілу і дурныя на розум. А ў хаце, кажды яго к сабе тагды падклікаў і добрым кавалкам хлеба ўгашчаў; на паляваньне часта стральцы бралі з сабою... Не шкадавалі пастухі ў полі Брысю прысмакаў, адно, каб ня ўцякаў ён ад іх дамоў і пільнаваў ад ваўкоў іх стаду. І ўжо будучы, нават, добра паджылым, сколькі пацех вытвараў! Накінуць, бывала, яны на галаву Брыся халацік, каб не нюхаў і нічога адзін не бачыў і доўга гэтак трымаюць, пакуль з іх не адбяжыцца далёка і не схаваецца добра, а потым пушчаюць яго шукаць і заўсёды знаходзіў, хоць пастух адбяжыць за поўвярсты і схаваецца на самай вяршыне высокае ёлкі... адразу трапляў Брысь на сьлед, нюхам аднаходзіў патрэбнае дрэва і, паднаўшы ў гару галаву, пачынаў моцна брахаць. Не адходзіў покуль пастух ня злазіў на зямлю, а потым Брысь здаволены і вясёлы круціўся са сковытам каля яго ног і абодва беглі да грамады пастухоў; з высалопленым языком сядаў Брысь у агульны круг, вочы яго пазабягалі то на пастухоў, то на іх пляценку, ведаў напэўна, што ў заплату за пацеху дастануць пастухі з пляценкі і хлеба кавалак і скваркі кусок... Аднак, цяпер і пастухі яго выракліся...

Сьпіць стары Брысь на кастрынішчы і сьніць сабе нешта з мінулай сваей маладасьці. Пляцецца скрозь сном, што нібыто бачыць ён качкі, а гаспадар яго раз-за-разам цэльна страляе, а ён іх з вады выцягае. Ой! як-жа многа ён іх нацягаў, а качкі ўсе сытыя і вялікія! Прыплюшчыў Брысь вочы і соладка ад успаміну зявае... Паўстала зьдзіўленьне: сапраўды стаіць перад ім са стрэльбаю за плячмі яго гаспадар; вачам сваім Брысь верыць ня хоча: быць можа і гэта ён сьніць, але выразна чуе, як яго гаспадар кліча: — на, Брысь, на!

— Гэта, мусіць, з мяне старога шкелі строяць? Але чаму? —

— На, Врысь, на! — далей усё кліча яго гаспадар.

Шавеліць Брысь бяз вусымі губамі, сіліцца радасна забрахаць, як даўней гэта рабіў,

справа скліканьня Сабору ў Польшчы да гэтай пары зьдзейсьніцца не магла. Пад націскам праваслаўнай апініі публічнай, а мо і з сваей іныцыятывы, шчыра ці ня шчыра, духоўная ўлада польскай аўтокефальнай царквы была ўжо распісаўшы выбары прадстаўнікоў на царкоўны Сабор і ўжо дзе ня дзе гэныя выбары адбыліся, аднак да скліканьня Сабору не дайшло.

Вось-жа цяпер аб гэтай справе патурбаваўся польскі міністр Веравызнаньняў і Асьветы высылаючы запросіны да праваслаўнага мітрапаліта ў Польшчы Дзяніса на конфэрэнцыю ў справе перагавораў з ім у справе скліканьня праваслаўнага Сабору ў Польшчы.

З заграніцы.

Англія аб палажэньні Украінскага народу пад Польшчай. Дня 20 мінулага м-ца на паседжаньні ангельскага парляманту пасол Мальон зьвярнуўся з запытаньнем да міністра заграчічных спраў аб палажэньні Украінскага народу пад Польшчай.

Пасол Мальон запытаўся ў міністра, ці ён ведае аб тым, што прадстаўнікі Украінскага народу пад Польшчай выслалі да Лігі Народаў 2 мэморыялы, адзін у справе ліквідацыі ўкраінскага народнага школьніцтва, а другі ў справе самаўрадаў. Міністр Гэндэрсон адказаў: афіцыяльна аб гэтых мэморыялах яшчэ пакуль што ня ведаю. Аднак спадзяюся, што яны будуць у Лізе Народаў разгледжаны. Аднак не раней, як 12 траўня, бо толькі тады адкрыецца сэсія Рады Саюзу Народаў.

Пры гэтым трэба адзначыць, што цяпер заграніца пачынае цікавіцца ўкраінскай справай, а прадусім публічная апінія ў Англіі, сярод якой якраз у праціўным кірунку працуе польская прапаганда.

Трэба адзначыць так-жа і той факт, што ў Лізе Народаў знаходзіцца такі-ж самы мэморыял і аб палажэньні Беларускага народу пад Польшчай, які так-жа хіба-ж будзе разглядацца 12 траўня Радай Саюзу Народаў.

У Югаславіі судзяць Харватаў. Як ведама, у югаслаўскай дзяржаве, дзе Сэрбы трымаюць у сваіх руках уладу, ня вельмі салодка жывецца Харватам і Славэнцам. Харваты і Славэнцы, баронячыя сваіх правоў, падводзяцца пад кадэкс дзяржаўнага права як здраднікі, замахоўцы супроць дзяржаўнага ладу. У выніку гэных змаганьняў за належныя правы для пакрыўджаных у мінулым годзе дайшло ў парляманце да стрэляніны і многіх вулічных выступленьняў. Хто чытаў „Б. Крыніцу“, той аб падзеях у Югаславіі ведае. Мы ў свой час аб гэтых падзеях пісалі.

Цяпер-жа югаслаўскі Найвышэйшы Суд вызначыў на дзень 24 г. м. судовую расправу над 24 Харватамі. Нязважаючы натое, што мейсца праступку абвінавачаных ёсьць места Загрэб, суд адбудзецца ў Белградзе.

Пісьмо праваслаўных да папы Пія XI. Расейская калёнія ў Рыме (Італія) з архімандрытам Сымэонам і сябрамі праваслаўнага клеру начале выслала пісьмо да папы Пія XI наступнага зьместу:

„Сябры расейскай калёніі ў Рыме просяць дазволу прыняць выражэньне свайго спачуцьця. Ясная надзея будзіцца ў нашых сэрцах, бо магутны адзыў да сумленьня выклікаў унівэрсальную і пераможную барацьбу проціў бязбожнікаў і іх грознай акцыі, проціў тых, каторыя прасьледуюць бязкарна ўсе рэлігіі. Проціў пагромшчыкаў маральнасьці і душыцеляў нашай бацькаўшчыны.“

Гэта пісьмо расейцаў у Рыме да папы Пія XI скіравана ў сувязі з выступленьнем папы ў справе прасьледаваньня камуністамі у С.С.Р.Р. рэлігіі.

У Чэхаславаччыне, як мы ўжо ня раз пісалі, Славакі дамагаюцца поўнай аўтаноміі. На чале гэтага кірунку стаіць патрыёт Славацкага народу кс. Глінка. Аўтанамічны рух Славакаў да таго сільны, што дзяржаўныя чэскія ўлады, прабуючы яго прыглушыць, павадыроў гэтага руху перадаюць у суд як здраднікаў дзяржавы.

У мінулым годзе чэскі суд славацкага пасла праф. Туку, які ёсьць павадыром побач з кс. Глінкам аўтанамічнага руху сярод Славакаў, засудзіў, як здрадніка дзяржавы на 15 гадоў цяжкага вастрогу. Цяпер гэта справа праф. Тукі пачалася разглядацца ў другой судовай інстанцыі — у судзе апэляцыйным. У гэтай расправе здарылася вялікая сэнсацыя. Апэляцыйны суд заявіў, што ў акружным судзе прапала часьць актаў з першага працэсу праф. Тукі. Цікава, як апэляцыйны суд будзе судзіць ня маючы прад сабой судовых актаў, а яшчэ больш цікава, каму меў на мэце прыслужыцца той, хто „згубіў“ гэтыя акты.

У Радавай Украіне сяляне, змагаючыся з камуністамі, паляць колектывы. У мяйсцовасьці Белазерску, каля Мэнітополя, грамада сялян падпаліла колектыўны (комуна) млын і ў агонь укінула старшыню мяйсцовага савету, сэкрэтара комуністычнай арганізацыі і кіраўніка „рабочай брыгады“. Усе тры яны згарэлі.

У крывароскай акрузе няма таго дня, каб „чырвоны пятух“ ня зьнішчыў колектыўных будынкаў. Гарыць увесь інвэнтар і запасы насеньня земляробскіх камунаў.

але, ня ведама чаму, здалеў толькі выціснуць з сябе жалобны скавыт.

— На, Брысь, на!

Падняўся Брысь сусім неахвотна і ляніва сьледам пашоў, сусім ня так, як даўней, будучы маладым і вясёлым, а апусьціўшы хвост, сусім маркотна, як які-небудзь праступнік.

Гаспадар вядзе яго за гумно ў поле, а ўсё аглядаецца і кліча: на, Брысь, на!

Пры лесе спыніўся. Брысь нешта нядобрае чуе і палахліва скавыча: старых сваіх вачэй ня спускае з стрэльбы, як-бы пытаючыся, чаго яго сюды прывялі. Бачыць, як гаспадар з пляча стрэльбу здымае, потым адышоў трохі ён у бок ад яго і бача, як-бы ў яго цэліцца...

— Ня можа быць?! — Ня верыцца Брысю — гэта, хіба, насьмяяцца толькі з яго хоча, але-ж нашто так страшна з старога сьмяяцца, гм... нашто?! Ці-ж ён у чым-небудзь вінен, ці зрабіў каму-небудзь крыўду якую, ці шкоду? Хоча Брысь сказаць гэта, хвастом пакручвае, але са страху сеў на заднія лапы і па яго мордзе пацяклі жалобныя горкія сьлёзы... Раптам агонь і страшэнны гук!!... і Брысь з вялікаю пякучаю ранаю зваліўся на зямлю, крыху аткрый аслабеўшыя векі і пасьпеў толькі ўбачыць, як ад яго шыбка пабег з стрэльбаю чалавек... Быць можа і зразумеў Брысь, чаму зьвёў яго з сьвету той чалавек, аднаго толькі ня мог ён сьцяміць, чаго так пасьпешна ад яго ўцякае, няхай-бы застаўся, ён-жа яшчэ перад сьмерцяй хацеў апошні раз лізнуць яму на разьвітаньне нагу.

З літоўскай мовы пераклаў
Юры Сабалеўскі.

11-3. 1930 г.
Вільня, Лукішкі.

Праўныя парады.

Пакрыўджанаму. У справе пляцу трэба Вам узнавіць судовы працэс. Гэту справу перадайце знаючаму цывільнае права адвакату. Самі гэтай справы не вядзіце, яна вельмі скамплікаваная.

Школа мастацтва (малярства) ёсьць школай вышэйшай — Унівэрсытэт. Каб туды паступіць, трэба мець матуру. З Вашай асьветай туды ня прымуць.

К. Гадоўскі. На прысуд трэба падаць апэляцыю. У другой інстанцыі бараніце справу сьведкамі трэцейскага суду і даўнасьцяй, а так-жа копіяй пастановы папярэдняга прысуду, калі праціўніку Вашаму было адказана.

Ф. Вілкойць. Запамогі не дададзенай Вашай жонцы ў часе вайны ня зышчаце.

Рудко. Тэстамант хоць і зацьверджаны, але сілы ён ня мае, бо зямля была маткі, а ня бацькі. Адвакат бараніў правільна па даўнасьці, але бацьку трэба было па даўнасьці зямлю зацьвердзіць за сабой, а тады апісываць.

Суд ужо закончаны, прысуд мае законную сілу і Вы нічога ня зробіце.

Ваша справа з вучыцельствам вельмі ўжо старая — 1925 г. і нічога з яе цапер скарыстаць ня можна. Яна астаецца, як гісторыя адносінаў польскіх уладаў да не палякоў на нашых землях. З пасадай трудна.

Аб гаспадарцы.

Бульба сягоньня ёсьць найбольш пашыранай расьлінай кармовай як жывёлы наагул, так і самага чалавека Асабліва на глебах ляхчэйшых, хоць і цяжэйшыя (гліна, глей) родзяць таксама добра, патрабуючы толькі адпаведны гатунак бульбы. Ад'емнай уласьцівасьцяй бульбы ёсьць хуткае ейнае выраджаньне. Таму трэба магчыма часта зьмяняць сяўбу; толькі не на сьлепа.

Як ужо сказана, бульба родзіць на кожнай глебе, але найлепш на глебе лёгкай (супясковай). Што датыча пагоды, дык бульба найлепш з усіх гаспадарскіх расьцін зносіць суш: ясная і цёплая пагода для бульбы далёка лепшая, чымся захмураная і дажджыстая. Мокрае лета бульбе шкодзіць: небясьпека гнілі і плясьненьня.

У гаспадарчым севазвароце бульбу найлепш даваць пасьля азіміны (жыта) Аржышча зразу-ж за сярпом падлушчыцца, пад восень пагноіцца хлеўным гноем, а заарэцца і пакінецца ў вострай баразьне праз зіму. На вясну забарануецца і садзіцца бульба. На глебах лёгкіх можна гнаіць вясной. Але ў такім разе падлушчанае аржышча на зіму другі раз не арэцца. Наагул бульба баіцца грунтаў „перапаханых“. Найлепшым гноем ёсьць гной ад жырнай скаціны. Пры веснавым гнаеньні хляўным гноем, гной гэты заарэцца, а з садзьбой самай трэба пачакаць, пакуль гной не разапрэе і ральля не асядзе. Калі няма хляўнога гною, трэба памагаць гноем штучным. Увосені ўжо найлепш даць, або р а н н а й вясной 7-8 мэтр. цэнтаў каініту, а за пару дзён прад садзьбой 2—2 з паловай мэтр. цэнт. супэрфосфату (на лёгкіх грунтох 3—мэтр. ц. Тгомасшляку). З азотных угнаеньняў даецца азотняк,—з м. ц.; усё рахована на 1 гэктар.

На садзьбу найлепш браць меншыя бульбіны, але цалком з д а р о в ы я, ня кроеныя. Пры нястачы сяўбы прыходзіцца яе рэзаць. Ня ўсякі гатунак бульбы разразаньне гэтакае вытрымае. Парэзаная сяўба мусіць завянуць. Найлепшай бульбай на сяўбу ёсьць такая, каторая мае глыбокія „вочкі“ і такую толькі можна на сяўбу рэзаць.

Што датыча часу сяўбы, дык агульным правілам ёсьць, каб садзілася бульба толькі ў глебу ўжо прагрэтую (у нас канец красавіка, травень). На прымаразкі бульба вельмі чуткая.

Аб спосабе саджэньня трэба зазначыць, каб не садзілася бульба на дно баразны, церпіць ад вільгаці і каб не садзілася за глыбока. Садзіцца на глыбіню шыркі далані (12 цм.). Добра было-б навучыцца спосабу саджэньня прынятага агульна заграніцай: прыгатаванае да садзьбы поле раўнуецца баронамі, а пасьля цягнецца па ім г. зв. „маркер“, які назначае мелкія (12 цм.) раўкі, адлеглыя ад сябе на 50-60 цм., у каторыя пасьля ўкідаецца садзьбовая бульба што 30-40 цм. Паміж двух такіх радкоў праводзіцца пасьля баразна адумысловым плугам (радло), паліца каторага загортывае адначасна два абапал ляжачыя раўкі засаджаныя ўжо бульбай. Работа вельмі простая, скорая і д о б р а я!

Засаджаная бульба патрабуе догляду. Як пачынае ўсхадзіць, яе трэба баранаваць лёгкімі (такімі, што маюць шмат зубоў) баронамі. Пасьля прыходзіць абарываньне, першае і другое. Гэтым-бы дагляд засаджанай бульбы кончыўся. Лішняе абарываньне шкодзіць. Апраўдана яно толькі тады, калі б здарыўся сільны дождж, які змыў-бы абарываньнем паўсталыя грабяні. Трэба пры гэтым кіравацца правілам, што каліва бульбы мусіць быць у зямлі не мялчэй, як 15—20 цм. (два-тры далані).

Капаньне бульбы ў дробных гаспадарках, пэўне-ж, доўга яшчэ будзе ручное. У гаспадарках большых добрымі аказаліся г. зв. вілаватыя капачкі. З аднаго ha (гэктара) зьбіраецца мусіць ня менш 100 мэтрычных цэнтаў (9,—) бульбы.

Пры зьмене сорту бульбы трэба асаблівую ўвагу зварочываць, каб сяўба была здаровай. Найнавейшай і найбольшай небясьпекай бульбы ёсьць хвароба, званая бульбяной р а к а в і н а й (chrysophlyctis endobiotica). Вельмі шкодным для бульбы ёсьць і рознае зельле, асабліва пырнік і лебяда. Мокрае лета небясьпеку гэту яшчэ больш зьвялічывае.

(З *працаў інж. Ад. Клімовіча.*

Да нас пішуць.

ВЫРАДАК СОЛТЫСАМ.

Хлюпічы, Стаўпецкага пав. Бываюць выродкі ў народзе, а нават і ў сям'і. Ёсьць вырадакі і ў нас. Наш вырадак ня быў вырадкам, пакуль ня быў начальнікам — солтысам. Як толькі выбралі за начальніка, вырадак пашоў супроць інтэрэсаў сваіх суседзяў. Нават і мовы роднай гэты вырадак пачаў чурацца. Сяляне ўжо скідалі вырадка з начальніцкага становішча, але вырадак, прылучыўшыся да сільных гэтага сьвету, не паслухаў і голасу сваіх суседзяў. Бяда, калі чалавек ня мае ў сабе людзкасьці, а хрысьціянін хрысьціянскасьці, тады ў гэтакім чалавеку пануе інстынкт зьвяраці.

Кожны чалавек, маючы ў сабе хоць крыху пачуцьця хрысьціянскай любові бліжняга, тае іскры чуцьця чалавечага, ніколі ня будзе рабіць другому зла дзеля свайго дабра. Гэтакія паступкі свойскія толькі людзям падобным да зьвяроў. Таксама кожны чалавек веруючы справядліва ў Бога і знаючы хоць крыху навуку Хрыста, ніколі ня будзе чурацца свайго народу, сваей мовы і сваіх звычаяў.

Дык ня можна браць прыкладаў з вырадкаў, а трэба толькі пазнаваць праўду і дамагацца справядлівасьці. Гучны.

ЯК У НАС ВЫБІРАЛІ ВОЙТА.

Дварэцкая гм., Наваградзкага пав. У нас гміннае начальства—войт ня выбранае, але назначанае. Незважаючы на тое, што паводле закону аб гміне начальнік—войт выбіраецца гміннай радай, але дзеля таго, што закон вымагае зацьверджаньня выбранца праз надзорчую ўладу — старасту, дык гэтай ласкі нашы выбранцы неяк не дастаюць і войт у нас з назначэньня. Ад пачатку польскіх у нас парадкаў ужо адслужылі ў нашай гміне 4 назначаныя войты. Сяляне ад самага пачатку з гэтакай сыстэмай назначаньня гмінных начальнікаў бязупынна змагаюцца і выбіраючы гмінную раду з сьвядомых беларусаў, наказываюць радным, каб яны выбіралі і войта беларуса. Радныя, ідучы за голасам выбаршчыкаў, войта выбіраюць свайго чалавека, а надзорчая ўлада мусіць так-жа, ідучы за голасам аднекуль, выбранага войта не зацьвярджае і на мейсца выбранага назначае.

У мінулым месяцы наша гмінная рада, карыстаючыся з сваіх правоў, патрэбавала выбараў войта. Выбары былі вызначаны на 15.III. с. г. Пачалася агітацыя. Панкі, падпанкі і ксёндз агітавалі, каб рада, у якой большасьць беларусаў выбралі войта паляка—панка, а радныя ведалі, што трэба рабіць і галасавалі на свайго кандыдата.

На выбарах быў прысутны і сам стараста.

Дзіўна, што ў прысутнасьці надзорчай улады да выбараў войта быў дапушчаны і ўрад гміны і з ліку 12 радных галасавала 14 асоб, як маючы права голасу. Гэтакага права здаецца і ў „ustawie gminnej“ няма. Аб гэтым трэба падаць да вышэйшай надзорчай улады —да ваяводы. Шпак.

ЗАГАВЕЛІ.

в. Скур'яты, Браслаўскага пав. Бяз культурна-прасьветнай арганізацыі моладзь дзічэе. У нашу вёску яшчэ не трапляе ніводная беларуская газэта. Арганізацыі роднай беларускай наша вёска ня знае. Дзіч як ў Афрыцы. Моладзь без „сьвінцовак“ (прылада да разбою) і з хаты ня выходзіць. Бойкі на парадку дня. Моладзь выглядае на дзікуноў. На запусты 4 сакавіка моладзь у свой дзікі спосаб устроіла гульню, у выніку якой адзін з учасьнікаў ад удараў „сьвінцовак“ загавеў жыцьцём—забілі на сьмерць. Забітага пахавалі, а 7 дзікуноў сьледчыя ўлады атправілі ў турму.

Дарагая моладзь і старэйшыя! Над гэтай праявай дзікасьці мала толькі дзівіцца, ад гэтага трэба лячыцца. Лякарства ад дзікасьці ўжо ўсяму сьвету ведамая, завецца яна **прасьвета**. Дык прымайма гэнае лякарства: выпісывайма свае беларускія газэты „Бел. -Крыніцу“ для старэйшых, а „Шлях Моладзі“ для малодшых, арганізуйма культурна-прасьветны гурток Бел. Інст. Гаспадаркі і Культуры, працуйма ў арганізацыі, чытайма свае родныя газэты і гэтакім спосабам забудземся дзікіх паступкаў, стыдаючыся іх. Родная газэта і свая арганізацыя пакажа нам шлях сьвятлейшай будучыні і навучыць нас, як да гэтага сьвятлейшага заўтра дайсьці. Родная газэта і арганізацыя вывядзе нас з сучаснага стану дзікасьці ў стан паступкаў годных чалавека.

М. Б.

ХРЫСЬЦІЯНСКАЕ ПАЧУЦЬЦЁ.

Рудаўка, Слонімскага пав. У нашай вёсцы здарыўся пажар. Пагарэльцы, у тым ліку сьвяшчэньнік, асталіся жабракамі —усё згарэла.

Гледзячы на такую бяду, людзі пачалі памагаць няшчасным хто чым можа. Некаторыя гавораць аб шырэйшай дапамозе пацярпеўшым. Сумна робіцца, гледзячы на бяду пагарэльцаў, але радасьць чуецца ў сэрцы, што пачуцьцё хрысьціянскае ў нашых людзей не заглохла. Так, бяда матэр'яльная ня ёсьць тады страшнай, калі ў сэрцах людзкіх гарыць агонь хрысьціянскай любові. Хрысьціянская міласьць лечыць і раны матэр'яльнага недастатку. З гэтага малога прыкладу можна зрабіць вялікі выснавак, што народ, маючы хрысьціянскі сьветагляд, пераможа ўсе матэр'яльныя беды. У народзе з хрысьціянскім сьветаглядам адзінкі або клясы бяднейшыя голаду цярпець ня могуць, бо хрысьціянства апіраецца не на сіле партыяў, кулака, стрэльбы або іншых прыладаў, а на **любові**. Кастусь С.

ТРЭБА ПРАСЬВЕТЫ І ВЕДЫ АБ СВАІМ НАРОДЗЕ.

Новая-Мыш, Баранавіцкага пав. У нас і навакол Н.-Мышы, як ведама, усё насельніцтва беларускае. Але школы беларускай, дык і з сьвечкай ня знойдзеш. Усе яны польскія. Вучаць беларускіх дзетак палякі вучыцялі па польску, знаёмячы беларусаў з польскай гісторыяй, з польскім народам, а пра гісторыю беларускага народу і наагул аб беларускім народзе, беларускае дзіця ня чуе ані слова. Расказываюць польскія вучыцялі беларускім дзецям аб: Варшаве, Кракаве, Пазнані, хваляць — польскіх каралёў, паэтаў, а пра беларускія месты нічога дзеці нашыя ў школе даведацца ня могуць. Ня знаюць нашыя дзеці і беларускіх паэтаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ф. Багушэвіча, К. Сваяка і інш. Словам, веда беларускага народу прад нашымі дзеткамі закрыта. Дзеці нашыя ў польскай школе могуць даведацца толькі аб народах чужых, а аб сваім народзе беларускім там дзіця не даведаецца.

Гэта так ёсьць з дзяцьмі. Ня лепш і з старэйшай моладзяй, але з гэтымі трудней паном вучыцялём.

Польскія вучыцялі, залажыўшы былі курсы для дарослых. Чаму-ж, навука рэч патрэбная. Моладзь пайшла. Але на гэтых курсах вучыцелька пачала хваліць Польшчу і польскія „гарцэжы“ кажучы, што з гэтых „гарцэжаў“ будуць людзі і папыталася ў аднаго хлапца, каб той вытлумачыў, чаму з „гарцэжаў“ будуць людзі. Хлапец па беларуску адказаў, што няведае. Вучыцелька абразіўшыся, пытае — „ty nie rozumiesz co ja mówię?“. Хлопец адказвае— „ані чагусенькі незразумеў аб чым пані гаварыла.“ Вучыцелька абразіўшыся яшчэ боль падкрэсьліла, што гэта школа польская, а не беларуская і мусіць у ёй быць усё польскае і папольску і прагнала хлапца з курсаў.

Вось-жа ў гэтым і ўся бяда, што гэта школа не беларуская, бо каб яна была беларуская, дык у ёй для беларускай моладзі ўсё былоб цікавае і зразумелае, а як яна не беларуская, дык нішто нашай моладзі ў ёй няцікавіць і зразумець там гутаркі вучыцеля трудна.

Браты сяляне! Пара ўжо даўно, каб у нас была школа беларускуя. Падавайма дэкляраці з дамаганьнем роднай школы.

Максім Салодкі.

Наша пошта.

К. Сьветав. З прысланых матэр'ялаў скарыстсем.

Макара М. Праўныя парады пісьмом даём толькі тым, хто прышле пашт. значок на 25 гр. Газэту для Вас будзем пасылаць і далей, але Вы павінны памятаць аб сваім абавязку. У Вашай справе трэба Вам зьвярнуцца ў пасольства С.С.Р.Р. у Варшаве, можа за пасрэдніцтвам яго даведаецеся аб сваім бацьку. Адшкадаваньня Вы ніякага атрымаць ня можаце.

Голцы. Вашыя матэр'ялы перадалі ў Рэд. „Сялянскае Нівы.“

Р. Рудко. Дакументы Вашы перадалі ў Бел. Пас. Клюб, а тое, што да нас адносілася—карыстаем.

Я. Вілкойцю і К. Садоўскаму Праўныя парады даём.

Дубку. З карэспандэнцыі карыстаем.

Гучнаму. Дужа цешымся з таго, што Вы хочаце стацца нашым сталым карэспандэнтам. Дык пішыце, будзем карыстаць!

З корэспандэнцыі карыстаем, пішыце больш, а вершык слабенькі і дзеля гэтага ня зьмесьцім. Гэты Ваш верш насьледаваны з Лермантава „Ангел“, аднак ён мала падобен формай і зьместам да „Ангела“. Прабуйце пісаць аргінальныя вершы.

М. Салодкаму. З прысланага карыстаем, газэту пасылаем.

К. Сэрафін. З Вашай весткі карыстаем, пішыце больш.

М. Б. За матэрыялы дзякуем, карыстаем.

Шпаку. З прысланага карыстаем. Просьбу Вашу па магчымасьці споўнім. Гэту справу скіравалі у кнігарню „Пагоню“.

Я. Саўка. Вершы разгледзім, калі будуць добрыя, то выдрукуем.

Т. Майсеенку. Газэту пасылаем, памятайце аб сваіх абавязках.

Я. Скапец. Газэта пасылаецца Вам акуратна, дамагайцеся на пошце.

А. Казлу. Усе залеглыя нумары „Б.-Крыніцы“ высланы Вам і далей пасылаем акуратна, дамагайцеся на пошце.

Будзянаму. Скарыстаем з прысланага. Просім паведаміць для ведама Рэдакцыі дакладны Ваш адрэс, імя і прозьвішча.

Маладому Дубку. З карэспандэнцыі скарыстаем, пішыце больш.

Я. Дубіцкаму. Праўную параду дамо праз пісьмо.

Я. Лукяновічу. З прысланага скарыстаем.

Я. Тарасэвічу. Газэту пасылаем, прысылайце падпісную плату.

З Кілдановічу. Газэта пасылаецца Вам акуратна, дамагайцеся на пошце. Зажадайце ад іх карты прэнумэраты, а пераканаецеся, што там Вашае прозьвішча фігуруе.

Ко-Ко. З прыслага скарыстаем.

Ал. Ламаносу. Вашу справу скіравалі у Бел. Пасол. Клюб.

Я. Каршуну. З штодзенных польскіх газэт у Вільні найлепш раім Вам запрэнумэраваць „Kurjer Wilenski“, бо ён найбольш дэмократычным. Адрэс бюра пасрэд. працы добра ня ведаем. Але пішыце так, то напэўна дойдзе: Wilno, Biuro Pośrednictwa Pracy.

„Беларускую Крыніцу“ пасылаем:

Алекс. Аламчуку, Я. Ключніку, Фр. Мікалаевічу, Б. Мацюлевічу, Я. Осьпіку, Я. Баркоўскаму, Ігн. Мішуку, Л. Падзяве, Я. Вайдеховічу, М. Бунару, М. Дзіку, С. Кусмічу, К Гесю, Ул. Малашэвічу, Г. Клакоўскаму, М. Білобрану, П. Скрынніку, Ул. Піваварчыку, В. Нестаровічу, Я. Місюлю, А. Мілюку, А. Гедзічу, В. Саўчыцу, Ст. Бліву, Ст. Грышку.

Грошы атрымалі ад: Др. К. 5 зл. А. Д. 6 зл., М. Елінскага 10 зл., Васіля Саўчыца 2 зл., Ул. Кондр 2 зл. 60 гр. А. Цікоты 5 зл., Ант. Гедзіча 3 зл., І. Мішука 3 зл. Я. Гарановіча 6 зл., Я. Місюля, Фр. Мікалаевіча, Я. Скапца, Ст. Грышкі, Анд. Мілюка, Ст. Бліна па 2 зл., К. Геся 1 злот, і Я. Шатраўскага 3 зл.

ВЫЙШЛА З ДРУКУ КНІЖКА

Smyk Biełaruski

Прадаецца ў ваўсіх беларускіх кнігарнях.
Галоўны склад:
Бел. Кнігарня „Пагоня“ Вільня, Людвісарская 1

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч